**«ЗВЯЗДА́ ПРАСВЕ́ТЛАЯ»**, рукапісны помнік перакладной старажытнабеларускай рэлігійнай л-ры, зборнік легенд і апавяданняў, звязаных з культам Дзевы Марыі. Як сведчыць адзін са спісаў, перакладзены са старабел. мовы на рус. «хлопам Мікітам» у Маскве ў 1668. Мае зах.-еўрап. паходжанне, аднак польск. і лац. арыгіналы не захаваліся. Складаецца з 15 раздзелаў, прысвечаных цудам Св. Дзевы Марыі. У бел. тэксце 15-ы раздзел адсутнічае. У рус. перакладзе ў ім змешчаны апавяданні пра абразы, а таксама выпіскі з інш. зборнікаў. У 1686 «З.п.» рыхтавалася да друку, але так і не была выдадзена.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова